# МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАЕ МАСТАЦТВА Ў ВІДЭАФАРМАЦЕ
## (новыя перспектывы арт-журналістыкі)

***А. П. Багданаў***

*Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў,*
*пр. Незалежнасці, 81, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*donald-bogdanov@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца новыя перспектывы арт-журналістыкі ў прэзентацыі твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў тэле-, відэа- і дакументальных фільмах. На прыкладзе відэафільма пра маладога беларускага мастака Глеба Отчыка аўтар паказвае, як правільна арганізаваныя інтэрв'ю са спецыялістамі, кінакамера дазваляюць перадаць сутнасць новых роспісаў і саму атмасферу абноўленага храма ў в. Вішнева Валожынскага раёна. Спыняецца на тым, якія якасці арт-журналіста сёння найбольш запатрбаваныя пры супрацоўніцтве з кінарэжысёрамі і аператарамі.

***Ключавыя словы:*** арт-журналіст; відэапрэзентацыя; культавыя збудаванні; канон; індывідуальнасць; традыцыя; інтэрв'ю.

# MONUMENTAL AND DECORATIVE ART IN VIDEO FORMAT
## (new perspectives of art journalism)

***A. P. Bagdanau***

*Belarusian State Academy of Arts,*
*81, Independence Av., 220012, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. P. Bagdanau (donald-bogdanov@ mail.ru)*

Ales Bogdanov's article «Monumental and decorative art in video format» examines new perspectives of art journalism in the presentation of works of monumental and decorative art in TV, video and documentary films. On the example of a the video about a young Belarusian artist Gleb Otchik, the author shows how well-organized interviews with specialists, a movie camera allow you to convey the essence of the new paintings and the very atmosphere of the renovated Church in d.Vishnevo Volozhinsky district. It focuses on what qualities of an art journalist are most in demand today when presenting works of monumental and decorative art in video.

***Key word:*** artjournal; video presentation; religious buildings; canon; identity; tradition; intervie.

На пачатку XXI стагоддзя на Беларусі з’явілася шмат новых унікальных твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Але арт-журналісты, жадаючы зафіксаваць для гісторыі і ацаніць іх, сутыкнуліся з некалькімі праблемамі. Па-першае, трэба было прэзентаваць не толькі свецкае, але і сакральнае, культавае, створанае паводле канонаў мастацтва, па-другое, хаця нават газеты перайшлі на каляровы друк, месца і ў часопісах (нават спецыялізаваных), і ў газетах на ілюстрацыі скарацілася. Затое з’явіўся інтэрнэт, пашырылася кола культуралагічных перадач на тэлебачанні. І цяпер арт-журналістыка мусіць асвойваць новы відэафармат. Ідэальна, калі ў рэжысёра і арт-журналіста ёсць узаемаразуменне. Альбо рэжысёр дакументальных, тэле-, відэафільмаў прафесійна валодае прыёмамі арт-журналістыкі. Мы паспрабуем праілюстраваць гэта на прыкладзе фільма кінарэжысёра, арт-журналіста Алега Лукашэвіча «Сакральнае мастацтва. Царква ў Вішневе». Алег Лукашэвіч стварыў серыю фільмаў «Сучаснае мастацтва Беларусі», прысвечаных творчасці такіх асоб, як Уладзімір Пракапцоў, Анатоль Бараноўскі і іншых. Фільм, пра які мы вядзём гаворку, прысвечаны афармленню храма Касмы і Даміяна ў в. Вішнева Валожынскага раёна, у прыватнасці роспісам, якія з’явіліся ў храме падчас рэстаўрацыі. Іх аўтар − малады мастак-манументаліст Глеб Отчык, адзначаны за гэтую працу Нацыянальнай прэміяй у галіне выяўленчага мастацтва.

Энцыклапедачныя выданні сведчаць, што «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» – «тэрмін, які часам ужываецца як сінонім *манументальнага мастацтва* ці для абазначэння кірунку манумент. мастацтва, дзе пераважае дэкар. аснова» [1, с. 91]. Тэрмін «манументальна-дэкаратыўнае мастацтва» нават спецыялісты пачалі ўжываць адносна нядаўна. Таму і ў друкаваных энцыклапедычных выданнях, і ў інтэрнэт-прасторы дакладна адназначнага тлумачэння гэтага віду мастацтва знайсці практычна немагчыма.

Тэрміналагічная недакладнасць абумоўлена тым, што толькі ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя манументальна-дэкаратыўнае мастацтва набыло свае адметныя рысы, пачалі складвацца нацыянальныя школы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Таму выкладчыкам, журналістам, студэнтам, усім, хто цікавіцца сучаснай культурай, калі з’яўляецца пытанне, ці можна далучыць той або іншы твор да манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, даводзіцца карыстацца рознымі інфармацыйнымі крыніцамі, часцей інтэрнэтам, прадстаўленым там ілюстрацыйным матэрыялам.

Храм у гонар бяссрэбранікаў Касмы і Даміяна ў в. Вішнева Валожынскага раёна – адзін з унікальных помнікаў сакральнага мастацтва Беларусі. Ён быў збудаваны ў 1863 годзе паводле тыповага на той час праекта ў рэтра-рускім стылі (так званыя «мураўёўкі»). Богаслужэнні вяліся практычна ўвесь час (за выключэннем перыяду Першай сусветнай вайны, калі тут ішлі баі). Касма і Даміян – два браты, якія жылі ў III стагоддзі, атрымалі добрую адукацыю, лячылі людзей, дапамагалі бедным. І пры гэтым далі зарок ніколі не браць хабару. Храм будаваўся хутка, без багатай аздобы. Але ўжо ў наш час было вырашана правесці рамонт і рэстаўрацыю. Мецэнатам стаў Сяргей Касцючэнка. Работы пачалі ў 2012 годзе, скончылі ў 2015-м. Абіраючы стыль аздобы інтэр’ера, мастакі наведалі Мірожскі манастыр на Пскоўшчыне. Там захаваліся роспісы, зробленыя візантыйскімі майстрамі.

Аўтар фільма дакладна абраў тэмпарытм, няспешны, нягучны. Гэта фільм-роздум. Як візуальны камертон успрымаюцца кадры, дзе храм і ўвесь храмавы комплекс паказаны з вышыні птушынага палёту, у кантэксце навакольнай прыроды, потым кананічныя роспісы, купал, які ёсць пашырэнне прасторы да Вечнасці. Але візуальны вобраз узмацняюць музыка і песнаспевы. Апроч эмацыянальнага ўздзеяння, глядач атрымлівае дастаткова шмат інфармацыі. І тут аўтар дэманструе магчымасці прафесійнай арт-журналістыкі. Ён не парушае агульнага тэмпарытму. Дакладна абірае тых, у каго бярэ інтэрв’ю. У фільме выкарыстаны не інтэрв’ю-дыялогі, а інтэрв’ю-маналогі. Айцец Аляксандр Чурыла, мастак, аўтар роспісаў Глеб Отчык, мастацтвазнаўца, рэктар БДАМ Міхась Баразна. Дзякуючы прафесійна і дарэчы пастаўленым пытанням, мы дазнаемся, як спалучаюцца канон, традыцыі, наватарства ў роспісах, пра тое, як успрымаюць іх вернікі, пра ўнікальнасць аздабення храма ў кантэксце сучаснага мастацтва.

Дзякуючы няспешным пазакадравым каментарыям мы бачым, што пры зменах асвятлення змяняецца адценне свячэння. Залаты колер мастак не выкарыстоўваў, а свячэнне прысутнічае. Менавіта дзякуючы складанаму, глыбокаму сіняму фону пашыраецца прастора, усё дыхае. І на вячэрняй службе зусім іншая атмасфера, чым на ранішняй. Узвышаныя кананічныя сюжэты дзякуючы менавіта такому каларыстычнаму вырашэнню набываюць дадатковую эмацыянальную сілу, поліфанічнае гучанне. Роспісы ўзмацняюць гучанне харавых песнаспеваў. А мігатлівае, жывое трапятанне свечак напаўняе храм таемным, урачыстым жывым святлом. Глеб Отчык прызнаецца: «Калі пішаш фрэску, вельмі важна адным мазком перадаць погляд, вока…».

Сучасныя мастакі, калі судакранаюцца з царкоўнымі канонамі, быццам адкрываюць у сабе новае светаадчуванне. Рускі філосаф П. Фларэнскі вельмі трапна заўважыў: «Мастак, абапіраючыся на ўсечалавечыя мастацкія каноны, калі такія ёсць або тут ці там знойдзены, праз іх і ў іх знаходзіць сілу ўвасабляць сапраўды ўбачаную рэчаіснасць і цвёрда ведае, што справа ягоная, калі яна вольная, не будзе ўдваеннем чужой справы, хаця прадмет клопату ягонага – не гэтае супадзенне з кімсьці, а сапраўднасць увасобленага ім» [2, с. 63]. У 2016 годзе ў гэтым храме з’явіўся незвычайны, мармуровы разьбяны іканастас і абразы, выкананыя ў тэхніцы мазаікі (аўтар П. Амельяновіч). Па-за сценамі храма ёсць барэльеф К. Касцючэнкі, дзе ўвасоблены Касма і Даміян. Аўтар фільма дае слова і аўтарам гэтых твораў. Такім чынам мы атрымліваем максімальную інфармацыю і адразу візуалізуем яе ў кантэксце ўзнёслага, урачыстага гучання Вечнасці. «Людзі, бачыўшы такую прыгажосць, тую працу, якая была сюды ўкладзена, не могуць застацца раўнадушнымі. Гэта кранае іх душу, сэрца», – прызнаецца айцец Аляксандр Чурыла, настаяцель храма ў в. Вішнева. Варта заўважыць, што мастакі, якія сёння распісваюць новыя храмы, наследуючы традыцыі, выкарыстоўваюць больш гучную палітру фарбаў, больш дынамічныя рытмы будовы кампазіцый. І гэта датычыць не толькі ўласна роспісаў, але і мазаік, вітражоў і г. д. Гэта звязана не толькі і не столькі з уласнымі схільнасцямі мастакоў, але найперш з тым, што дынамізуецца наша жыццё, нават час, як сцвярджаюць даследчыкі, на сёння рухаецца хутчэй. У выніку істотна розніцца атмасфера ў старажытных і сучасных храмах. І мы мусім ведаць, што менавіта творы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, роспісы, мазаікі, зробленыя нашымі сучаснікамі, хутчэй далучаюць да разумення высокіх ісцін. І пры гэтым, не парушаючы канонаў, праз рытміку, каларыт, новае, сучаснае пачуццё гармоніі дапамагаюць сучаснікам адшукаць свой шлях да Храма.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Т. 10. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2000.
2. *Флоренский П.* Иконостас. Избранные труды по искусству. СПб. : Мифрил. Русская книга, 1993. 366 с.